*УДК 002.2*

*Н. І. ШЫШКІНА, Л. І. ПЯТРОВА, М. А. ЗІЛЬБЕРГЛЕЙТ*

# ЭКАЛАГІЧНАЯ КНІГА: АД ПРАЦ СТАРАЖЫТНАГРЭЧАСКІХ ВУЧОНЫХ ДА РАСІЙСКІХ ВЫДАННЯЎ КАНЦА XIX СТАГОДДЗЯ

*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 07.10.2004)*

Артыкул прысвечаны стварэнню цэласнага ўяўлення аб экалагічнай кнізе як аб сацыяльна-гістарычнай з'яве, эвалюцыя якой непарыўна звязана з пераўтварэннем сфер грамадскай дзейнасці. У прапанаванай публікацыі мы разглядаем рэпертуар выданняў эклагічнага зместу, які «выйшаў у свет» на тэрыторыі расійскай дзяржавы ў XVIII–XIX стст.

Перш чым дэталёва даследаваць асаблівасці кнігавыдання гэтага часу, неабходна найбольш сцісла абагульніць уяўленні аб экалагічнай літаратуры ў папярэдні перыяд. Важна падкрэсліць, што першапачатковае назапашванне ведаў у галіне экалогіі адбывалася ў еўрапейскіх дзяржавах, а значыць, і ўсе навуковыя працы па дадзенай тэматыцы былі надрукаваны ў гэтых краінах.

Характарыстыку першых крокаў на шляху фарміравання экалагічных уяўленняў звычайна пачынаюць з навуковых трактатаў Арыстоцеля (384—322 гг. да н. э.) — «Гісторыя жывёл» (складаецца з трох раздзелаў: аб частках жывёл, аб іх узнікненні, апісанне жывёл); Тэафраста (370—285 гг. да н. э.) — «Прыродазнаўчая гісторыя раслін»; Плінія Старшага (23—79 гг. н. э.) — «Прыродазнаўчая гісторыя». Менавіта іх погляды зрабілі найбольшы ўплыў на біяэкалагічны светапогляд вучоных сучаснасці.

Ацэньваючы творы даўніх грэчаскіх і рымскіх вучоных, трэба памятаць, што гэта быў перыяд далёкай перадгісторыі экалогіі як навукі. Працы натуралістаў, уключаючы змешчаныя на іх старонках многія памылковыя апісанні і сцверджанні, у часы Сярэдневякоўя былі асвячоны аўтарытэтам царквы і цалкам дагматызаваны, што зусім не спрыяла развіццю навукі і асобных яе галін. Але нягледзячы на ўсе недакладнасці, гэтыя творы яшчэ вельмі доўгі час выклікалі цікавасць і былі запатрабаваны. Аб гэтым сведчыць іх выданне ў XV–XVI стст. і шматкратнае перавыданне (табл. 1). Стан змяніўся ў эпоху Адраджэння. Надзвычайныя адкрыцці, якія прынеслі з сабой вандраванні вучоных-натуралістаў у аддаленыя краіны з уласцівым ім экзатычным светам, міжвольна выклікалі цікавасць да экалагічных назіранняў. Пры гэтым увага вучоных пераключылася з простага паўтарэння старажытных тэкстаў на вывучэнне мясцовых і «чужаземных» жывёл, птушак і раслін. Сведчаннем пераходу да гэтага новага плённага этапу з'яўляюцца творы швейцарскага натураліста, прафесара прыродазнаўчых навук К. Геснэра (1516—1565) «Historiae animalium» («Гісторыя жывёл») і італьянскага вучонага, прафесара натурфіласофіі Балонскага універсітэта, пачынальніка пры ім аднаго з першых батанічных садоў і музея жывёл У. Альдравандзі (1522—1602) «Ornithologiae» («Арніталогія»).

Праца Конрада Геснэра «Гісторыя жывёл» з'яўляецца выданнем энцыклапедычнага характару ў пяці тамах, якія напісаны на лацінскай мове. Да першага тома энцыклапедыі дададзены паказальнік яўрэйскай, грэчаскай, рымскай і іншай выкарыстанай літаратуры. Тамы другі і трэці суправаджаюцца гравюрамі, прычым іх аб'ём складае пятую частку выдання [1, с. 482]. Ілюстрацыі ў кнігах зроблены або самім аўтарам, або запазычаны ў П. Бэлана, Г. Рандле, А. Дюрэра. Малюнкі былі настолькі ўдалыя, што пазней іх выдавалі асобнымі зборнікамі («Icones»). Гэта капітальная праца, што выдавалася з 1551 па 1587 г. аж да XIX ст., з'яўлялася падручнікам па эказаалогіі (аб чым сведчаць паметкі на экземплярах выданняў, якія захоўваюцца ў Дарвінскім музеі ў г. Маскве). Уяўленне аб «выхадзе ў свет» гэтай кнігі даюць даныя табл. 2.

Кніга У. Альдравандзі «Арніталогія» — выданне энцыклапедычнага характару. У ёй славуты даследчык меў на мэце сабраць, апісаць і праілюстраваць усю шматвобразнасць свету прыроды. Гэта выданне, якое пацвярджае высокі статус вучонага і яго твора, звычайна станавілася каштоўным даведнікам для ўрачоў, фармацэўтаў і батанікаў таго часу. Бібліяграфічныя даныя гэтага выдання прыведзены ў табл. 3.

Т а б л і ц а 1. **Бібліяграфічныя даныя выданняў Арыстоцеля, Тэафраста, Плінія Старшага**

| Назва | Год выдання | Месца выдання | Выдавец-друкар | Аб'ём, стар. |
|---|---|---|---|---|
| Гісторыя жывёл | 1476 | Венецыя | Iohannes de Colonia | 252 |
| | 1587 | Франкфурт-на-Майне | C. Marnium, J. Aubrium | 484 |
| | 1584 | Ліён | A. de Harsy | 144 |
| Прыродазнаўчая гісторыя раслін | 1529 | Парыж | Egidium Courmoncium | 343 (15 кн.) |
| | 1534 | Базель (Швейцарыя) | Andream Cratandrum | 264 (9 кн.) |
| | 1552 | Венецыя | Aldi Filios | 652 |
| Прыродазнаўчая гісторыя | 1510 | Ліён | Alexandro Benedicto | 818 |
| | 1511 | Ліён | N. Maillard | 262 |
| | 1514 | Парыж | Nicolao de Pratis | 262 |
| | 1516 | Кёльн | J. Caesarius | 262 |
| | 1524 | Парыж | H. Barbarus | 311 |
| | 1524 | Венецыя | Petrum Serenae | 536 |
| | 1525 | Базель (Швейцарыя) | D. Erasmus | 565 |
| | 1530 | Базель (Швейцарыя) | H. Froden | 671 |
| | 1532 | Парыж | Ioannis Parui | 671 |
| | 1536—1538 | Венецыя | A. Rabiriu | 912 |
| | 1540 | Венецыя | Petrum Serenae | 295 |
| | 1543 | Парыж | Audoonum Paruum | 671 |
| | 1543 | Парыж | Petrum Regnault | 671 |
| | 1545 | Базель (Швейцарыя) | Nicotaum Episcopium | 671 |
| | 1548 | Ліён | Marcelli Beringorun | 976 |
| | 1553 | Ліён | Michael Syluius | 679 |
| | 1555 | Парыж | Turnebus | 436 |
| | 1558 | Венецыя | Paulum Manutium | 976 |
| | 1561 | Ліён | Jacobi Juntae | 446 |
| | 1563 | Ліён | Sumpherianus Barbier | 679 |
| | 1571 | Венецыя | Hieronymum Seotum | 422 |
| | 1582 | Франкфурт-на-Майне | Sigismundi Feyerabendij | 528 |
| | 1582 | Ліён | Petrum Santandreanum | 679 |

Т а б л і ц а 2. **Бібліяграфічныя даныя шматтомнага выдання К. Геснэра «Гісторыя жывёл»**

| Том | Год выдання | Месца выдання | Друкарня | Аб'ём, стар. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1551 | Цюрых | Christoph Fraschouerum | 1104 |
| 2 | 1554 | Цюрых | Christoph Fraschouerum | 137 |
| | 1586 | Франкфурт-на-Майне | Ioannis Wecheli | 119 |
| 3 | 1555 | Цюрых | Christoph Fraschouerum | 906 |
| | 1585 | Франкфурт-на-Майне | Ioannis Wecheli | 806 |
| 4 | 1558 | Цюрых | Christoph Fraschouerum | 1297 |
| 5, ч. 1 | 1587 | Цюрых | Froschouiana | 96 |

Т а б л і ц а 3. **Бібліяграфічныя даныя двухтомнага выдання У. Альдравандзі «Арніталогія»**

| Том | Год выдання | Месца выдання | Друкарня | Аб'ём, стар. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1599 | Балоння | Franciscum de Francisus | 893 |
| 2 | 1600 | Балоння | Franciscum de Francisus | 560 |

Твор Уіліса Альдравандзі «Арніталогія» разам з творамі Конрада Геснэра з'яўляліся практычна адзінымі вядомымі ў XVI ст. спробамі апісаць жывёл і абагульніць веды аб іх жыцці ў залежнасці ад умоў знаходжання ў прыродзе (што і абазначае прывесці экалагічныя звесткі). Важна адзначыць, што нягледзячы на працэс інтэнсіўнага назапашвання біялагічных ведаў вучонымі разглядаемага перыяду, К. Геснэр і У. Альдравандзі так і не парвалі з даўнімі аўтарытэтамі ў галіне пазнання прыроды, разумеючы сваю дзейнасць перш за ўсё як працу па прадаўжэнню работ Арыстоцеля і яго паслядоўнікаў.

Даследаванне галіновай кнігі немагчыма без уварвання ў тыя навуковыя і практычныя абсягі, якія яна адлюстроўвае. Экалогія, як кожная навука, складаецца з пытанняў тэарэтычнага характару (пошук заканамернасцей развіцця прыроды), а таксама практычнага выкарыстання (ужыванне тэарэтычных ведаў у гаспадарчай дзейнасці людзей). У выніку правядзення кнігазнаўчага даследавання экалагічных выданняў мы можам вылучыць афіцыйныя выданні заканадаўчага характару. У часы фарміравання прыродазнаўчанавуковых поглядаў на законы прыроды ніхто не дапускаў, што прыродаахоўная дзейнасць будзе з'яўляцца складанай часткай комплексу экалагічных навук. Але з сучаснага пункту погляду нарматыўныя заканадаўчыя дакументы, якія тычацца аховы прыроды, мы адносім да экалагічных выданняў прыкладнога кірунку. На ранніх стадыях быцця людскога грамадства яны выяўляліся ў грамадскіх забаронах і меркаваных санкцыях на хаатычную высечку дрэў розных парод, на нарміраванне лоўлі рыбы, на абарону месцаў гнездавання сокалаў, лебедзяў і абітання баброў, а таксама аб мерах супраць пажараў у пушчах і лясах. «Статут Вялікага княства Літоўскага» 1588 г. з'яўляецца зборам законаў феадальнага права, які дзейнічаў у Вялікім княстве Літоўскім з 1589 г., а пасля ўз'яднання Беларусі і Расіі — да 1831 г. Асноўны тэкст складаецца з 14 раздзелаў, якія ўключаюць 488 артыкулаў. У гэтым галоўным заканадаўчым дакуменце прысутнічае 7 артыкулаў прыродаахоўнага зместу. Статут упершыню быў надрукаваны на старабеларускай мове ў 1588 г. у віленскай друкарні Мамонічаў пад наглядам віцэ-канцлера Сапегі [2]. А паколькі статут некалькі стагоддзяў меў законную сілу, то шматразова перавыдаваўся [3]. У табл. 4 прыведзены даныя аб перавыданні «Статута Вялікага княства Літоўскага».

Т а б л і ц а 4. **Даныя аб перавыданні «Статута Вялікага княства Літоўскага» з XVI па XIX ст.**

| Год перавыдання | Месца перавыдання | Мова перавыдання |
|---|---|---|
| каля 1592—1593 | Вільня, выд. Мамонічаў | старабеларуская |
| 1594—1595 | Вільня, выд. Мамонічаў | старабеларуская |
| 1614, 1619, каля 1623 | Вільня, выд. Мамонічаў | польская |
| 1648 | Варшава, выд. П. Элерта | польская |
| 1693, 1744, 1786 | Вільня, акадэмічная друкарня | польская |
| 1811 | Санкт-Пецярбург | польская, руская |
| 1819 | Вільня, друк. А. Марціноўскага | польская |
| 1854 | Масква | беларуская |

Як адзначалася вышэй, XVI ст. характарызуецца як перадгісторыя будучай навукі экалогіі. У колах вучоных з'яўляецца цікавасць да заабіяэкалагічных даследаванняў, аб чым сведчыць пачатак выдання і перавыдання прац даўніх вучоных, а таксама ўласных. У разглядаемы намі перыяд было выдадзена пяць кніг, якія не з'яўляліся «чыста» экалагічнымі, а змяшчалі толькі некаторыя экалагічныя даныя і абагульненні. Нягледзячы на ўсе недахопы, менавіта яны садзейнічалі развіццю новай навуковай дысцыпліны. Усе кнігі публікаваліся на лацінскай і грэчаскай мовах у друкарнях замежных краін (Францыя, Швейцарыя, Італія, Германія) прыватнымі выдаўцамі. Гэтыя творы мелі рознае прызначэнне: навуковае, практычнае, вучэбнае і выкарыстоўваліся як вучонымі, так і проста дапытлівымі людзьмі. Пасля аналізу кніг па прыродазнаўчай навуцы XVII ст. намі не было знойдзена ні аднаго выдання, якое па свайму зместу можна было б аднесці да экалагічнага. У літаратуры сустракаюцца толькі ўпамінанні аб асобных навуковых працах і эксперыментах экалагічнага напрамку англійскага фізіка, хіміка Роберта Бойля і галандскага мікраскапіста Антоні ван Левенгука. Але нам не ўдалося знайсці публікацыі гэтых прац. Можна толькі меркаваць, што выдадзены яны былі ў друкарні Лонданскага каралеўскага таварыства (фактычна англійская акадэмія навук), таму што ўся навуковая праца вучоных праходзіла ў сценах гэтай установы і мела плённы працяг.

У пачатку XVIII ст. у жыцці Расіі адбываліся карэнныя змены. З разрывам рэлігійных традыцый мінулага новая руская культура прыдбала ярка выяўлены свецкі характар. Ствараліся навуковыя і асветніцкія ўстановы, якія спрыялі развіццю рускай навукі. Выдавецкая справа ў XVIII ст. атрымала шырокі размах. Да гэтай пары яна служыла пераважна патрэбам царквы. З прыходам да ўлады Пятра I пачалі адкрывацца новыя друкарні і пераўтварацца ўжо існуючыя, якія карэнным чынам змянілі тэматычны рэпертуар выпуску выданняў. Калі да XVIII ст. кнігі па прыродазнаўчай навуцы (у прыватнасці экалагічныя) друкаваліся толькі ў краінах Еўропы, то з адкрыццём у 1724 г. Расійскай Акадэміі навук (а ў 1728 г. друкарні пры ёй) Расія стала займаць адно з вядучых месцаў па выпуску навуковых прац.

Акрамя друкавання навуковых кніг акадэмічная друкарня выдавала і афіцыйную літаратуру — заканадаўчыя дакументы (указы, рэгламенты, статуты). Па іх змесце можна прасачыць, на вырашэнне якіх пытанняў была накіравана палітыка дзяржавы.

Займаючыся вывучэннем гэтай выдавецкай прадукцыі, намі быў выяўлены рад указаў, якія рэгламентавалі прыродаахоўную дзейнасць у Расіі і былі выдадзены ў 1714—1729 гг. Зразумела, мы прызнаём, што выданне гэтых заканадаўчых дакументаў, якія адлюстроўвалі развіццё рускага заканадаўства, было звязана з практычнымі задачамі і патрэбамі грамадства і ніхто іх змест не супастаўляў з аховай прыроды дзеля самой аховы прыроды, а менавіта яны паклалі пачатак прыродаахоўнаму руху ў Расіі. Уяўленне аб выданні указаў экалагічнага зместу дае табл. 5.

Т а б л і ц а 5. **Выпуск указаў экалагічнага зместу 1714—1729 гг. у Расіі**

| Год выдання | Колькасць указаў прыродаахоўнага характару | Агульная колькасць указаў за год |
|---|---|---|
| 1714 | 1 | 33 |
| 1715 | 2 | 22 |
| 1716 | — | 20 |
| 1717 | — | 12 |
| 1718 | 1 | 41 |
| 1719 | 5 | 50 |
| 1720 | 7 | 84 |
| 1721 | — | 86 |
| 1722 | 4 | 99 |
| 1723 | 7 | 97 |
| 1724 | 3 | 106 |
| 1725 | 1 | 89 |
| 1726 | 1 | 82 |
| 1727 | 2 | 75 |
| 1728 | — | 62 |
| 1729 | 1 | 99 |

Указы імператара Пятра І шматразова перавыдаваліся ў 1739 г. (3 разы), 1777 г. (2 разы), 1780 і 1799 гг. у імператарскай друкарні Акадэміі ў Санкт-Пецярбурзе [4]. Пытанні, якія разглядаліся ў гэтых нарматыўных дакументах, зводзіліся да забароны бяздумнай высечкі лясоў, аховы рэдкіх відаў жывёл і рыб, стварэння запаведнікаў, захавання лекавых сродкаў некаторых водных крыніц. Доля ўказаў, якія накіраваны на абарону прыроды, у агульнай колькасці выдадзеных у гэтым прамежку часу ўказаў невялікая (каля 3%), але важны сам факт іх прысутнасці ў дзяржаўнай палітыцы дзяржавы.

У 1724 г. па ініцыятыве Пятра І у Санкт-Пецярбурзе была створана Акадэмія навук, якая па задуме яе стваральніка павінна была не толькі навукі «производить», але і «оные распространять» [5, с. 4]. У ліку гэтых «оных» былі і прыродазнаўчыя навукі (да якіх мы ўмоўна прылічваем і экалагічныя). Прычым іх развіццё дыктавалася ўмовамі палітыкі, якая рэалізоўвалася ў краіне. Рускімі вучонымі пры фінансавай падтрымцы ўрада была рэалізавана вялікая колькасць экспедыцыйных даследаванняў для апісання, вывучэння і сістэматызацыі флоры і фауны Расіі, якія насілі экалагічнае адценне. Вынікамі гэтых экспедыцый з'явіліся працы прафесараў Акадэміі навук С. П. Крашанінnікава, І. І. Ляпёхіна, П. С. Паласа, Г. Ф. Мілера і доктара ўрачэбных навук І. Г. Гмеліна, выдадзеныя ў акадэмічнай друкарні ў Санкт-Пецярбурзе (табл. 6). Друкарня Акадэміі навук выдавала працы не толькі рускіх вучоных, але і займалася выданнем перакладных кніг па прыродазнаўству. Бібліяграфічныя даныя перакладных кніг па прыродазнаўству, якія выдадзены ў друкарні пры Акадэміі навук у XVIII ст., прыведзены ў табл. 7.

Акрамя друкарні пры Акадэміі навук у Санкт-Пецярбурзе выданнем твораў экалагічнай тэматыцы займалася і універсітэцкая друкарня ў Маскве. Так, у 1784 г. выйшаў з друку твор англійскага вучонага У. Дэрэма «Фізіка-тэалогія» (аб'ёмам 489 стар.) у перакладзе на рускую мову, які быў перавыдадзены ў 1797 г. (таксама ў Маскве).

Адначасна з развіццём экалагічнага кнігавыдання ў Расіі і Еўропе публікаваліся навуковыя працы, якія былі прысвечаны экалагічнай тэорыі і практыцы. Вядомы наступныя творы: шасцітомныя «Мемуары па прыродазнаўчай гісторыі насякомых» (1734—1742) француза Рэнэ Рэамюра і «Мемуары да гісторыі прэснаводных паліпаў з рукамі ў форме рагоў» (1744) швейцарца А. Трамбле.

У сувязі з шырокай сеткай агульнаадукацыйных і спецыяльных школ, якія былі адкрыты ў першай палавіне XVIII ст., узнікла вельмі вялікая патрэбнасць у падручніках. Прафесар Акадэміі навук В. Ф. Зуеў напісаў падручнік «Нарысы прыродазнаўчай гісторыі», які быў выдадзены ў Санкт-Пецярбурзе (друкарня Брэйткапфа) для «народных вучылішчаў Расійскай імперыі» ў 1786 г., тыражом 3000 экзэмпляраў, аб'ёмам 460 старонак. Гэтую кнігу многія вучоныя адносяць да выданняў па экалогіі пачатковага перыяду яе развіцця [6]. Падручнік шмат часу быў вельмі папулярны і перавыдаваўся два разы ў XVIII ст. (друк. Брэйткапфа, 1789; друк. Вількоўскага, 1794) і тры разы ў XIX ст.

Т а б л і ц а 6. **Бібліяграфічныя даныя прац, выдадзеных рускімі вучонымі у друкарні пры Акадэміі навук у XVIII ст.**

| Аўтар | Назва кніг | Год выдання | Аб'ем, стар. | Тыраж, экз. | Колькасць перавыданняў |
|---|---|---|---|---|---|
| С. П. Крашаніннікаў | Апісанне зямлі Камчаткі | 1755 | 757 | 1350 | 3 |
| І. І. Ляпёхін | Роздумы аб патрэбе адчуваць лекавую сілу ўласнага росту | 1783 | 30 | 400 | — |
| | Дзённыя запіскі падарожжа доктара Акадэміі навук ад'юнкта Івана Ляпёхіна па розных правінцыях Расійскай дзяржавы | ч. 1 — 1768<br>ч. 2 — 1770<br>ч. 3 — 1780<br>ч. 4 — 1805 | 538<br>342<br>378<br>458 | 600 | 2 |
| Г. Ф. Мілер | Апісанне Сібірскага царства | 1750 | 457 | 1325 | 2 |
| І. Г. Гмелін | Падарожжа па Расіі для даследавання трох царстваў існасці | ч. 1 — 1771<br>ч. 2 — 1777<br>ч. 3 — 1785 | 272<br>362<br>737 | 600 | — |
| П. С. Палас | Падарожжа па розных правінцыях Расійскай дзяржавы | ч. 1 — 1773<br>ч. 2: кн. 1— 1786<br>кн. 2 — 1786<br>ч. 3 — 1773 | 117<br>468<br>571<br>480 | 600 | 2 |

Т а б л і ц а 7. **Бібліяграфічныя даныя перакладных кніг па прыродазнаўству, выдадзеных у друкарні пры Акадэміі навук у XVIII ст.**

| Аўтар | Назва кніг | Год выдання | Аб'ём, стар. | Тыраж, экз. | Колькасць перавыданняў (з якой мовы пераклад) |
|---|---|---|---|---|---|
| Ж. Бюфан | Агульная і прыватная прыродазнаўчая гісторыя графа дэ Бюфана | ч. 1 — 1789<br>ч. 2 — 1790<br>ч. 3 — 1790<br>ч. 4 — 1792<br>ч. 5 — 1792<br>ч. 6 — 1801<br>ч. 7 — 1802<br>ч. 8 — 1804<br>ч. 9 — 1806<br>ч. 10 — 1808 | 374<br>401<br>403<br>325<br>480<br>400<br>379<br>310<br>275<br>271 | 560 | 3 (з французскай) |
| К. Лінэй | Грамадскі лад прыроды | ч. 1 — 1792<br>ч. 2 — 1800 | 120<br>202 | — | 1 (з нямецкай) |

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што з цягам часу адбываецца нарошчванне тэмпаў выпуску экалагічных выданняў: у XVII ст. — 5, а ў XVIII ст. — 8 назваў (з якіх 6 — у Расіі, 2 — у Еўропе) пераважна на рускай мове. Прычым пераважная большасць кніг выйшла ў Санкт-Пецярбурзе ў друкарні пры Акадэміі навук і толькі невялікая колькасць у прыватных друкарнях і ва універсітэцкай друкарні ў Маскве. Тэматыка выдадзеных кніг сведчыць аб хуткіх тэмпах развіцця новай навуковай дысцыпліны, якой з'яўляецца экалогія. Шматразовыя перавыданні прац рускіх вучоных — сведчанне павышанай і незгасальнай цікавасці да рускай флоры і фауны, а значыць, да экалагічных назіранняў. У XVIII ст. у заканадаўчай палітыцы Расійскай дзяржавы прысутнічаюць нарматыўныя дакументы, якія адносяцца да аховы птушак, рыб, некаторых відаў жывёл і раслін, да стварэння запаведных тэрыторый. Можна з поўнай адказнасцю сцвярджаць, што ў аналізуемым перыядзе быў пакладзены пачатак прыродаахоўнаму руху, які на сучасным узроўні дасягнуў глабальных памераў.

З тыпалагічнага пункту погляду ўсе кнігі экалагічнай тэматыкі, што былі выдадзены ў XVIII ст., — навуковыя, навукова-папулярныя, вучэбныя і афіцыйныя.

Пачатак XIX ст. адзначаны зменамі ў рускай эканоміцы, палітыцы, навуцы, адукацыі і кніжнай справе. Гэтаму перыяду прысвечаны выключна важныя этапы фарміравання сучаснай навукі — завяршэнне яе перадгісторыі, стварэнне тэарэтычных асноў, фармулёўка паняццяў і вызначэння экалогіі як самастойнай тэарэтычнай дысцыпліны ў рамках біялогіі, удакладненне кола аб'ектаў экалагічнага вывучэння ў мэтах вырашэння некаторых пытанняў практыкі. Гэтыя гістарычныя для экалогіі падзеі непарыўна звязаны перш за ўсё з імёнамі выдатных рускіх, а таксама замежных вучоных і іх навуковымі творамі — Ч. Дарвіна «Пахо-

джанне відаў шляхам прыродазнаўчага адбору, ці захаванне спрыяльных парод у барацьбе за жыццё» (СПб., 1864), Э. Гэкеля «Сусветная марфалогія арганізмаў» (СПб., 1878), К. Ф. Рулье «Аб уплыве вонкавых умоў на жыццё жывёл» (М., 1845), М. А. Северцава «Перыядычныя з'явы ў жыцці жывёл, птушак і гадаў Варонежскай губерні» (М., 1855), В. В. Дакучаева «Да вывучэння аб зонах прыроды» (СПб., 1899), Э. А. Эверсмана «Уводзіны ў лепідаптэралогію Расіі» (Казань, 1854), А. Ф. Мідэндорфа «Падарожжа на поўнач і ўсход Сібіры» (СПб., 1860).

Ужо ў сярэдзіне XIX ст. адчуваўся не толькі якасны, але і колькасны рост даследаванняў жывёльнага і раслыннага свету. Калі раней мы вымушаны былі абмяжоўвацца ўпамінаннем толькі асобных канкрэтных прац, то ў разглядаемым перыядзе колькасць іх так павялічылася і дасягнула такога метадычнага і тэарэтычнага ўзроўню, што дазволіла перайсці да стварэння агляду літаратуры экалагічнай тэматыкі.

У табл. 8 прыведзены даныя аб выпуску экалагічных кніг у трох буйнейшых гарадах Расіі. Гэтыя гарады абраны дзякуючы найвялікшым паказчыкам, бо ва ўсіх іншых (Арэнбурзе, Ташкенце) выдавалася толькі пара назваў, і гэта невыпадкова, таму што цэнтрамі развіцця экалагічных ведаў з'яўляліся біялагічныя факультэты Маскоўскага і Казанскага універсітэтаў, а таксама Акадэмія навук у Санкт-Пецярбурзе. З прыведзеных даных бачна, што найбольшая колькасць экалагічных кніг выдавалася ў Санкт-Пецярбурзе (34 адзінкі), Масква займае другое месца (16 адзінак), Казань — трэцяе (5 адзінак). Пікавым дзесяцігоддзем для двух першых гарадоў з'яўляецца сёмае (1861—1870).

Айчынныя навукова-асветніцкія ўстановы выконвалі не толькі педагагічныя функцыі, але і навукова-даследчыя. Акадэмікі і прафесары павінны былі займацца не толькі навукамі, але і наглядаць за навуковай літаратурай, складаць зводкі («экстракты») навуковых дасягненняў па сваёй спецыяльнасці, правяраць правільнасць адкрыццяў [7]. Калі ўлічыць, што рускія эколагі ўнеслі ўклад, які абумоўлівае назапашванне ведаў прыкладнога характару, а развіццё тэорыі экалогіі да канца XIX ст. вызначалася галоўным чынам працамі замежных вучоных, то важна адзначыць, што перавыданне на рускую мову тэарэтычных твораў замежных вучоных рабілася практычна адначасна з выданнем арыгінала.

Т а б л і ц а 8. **Выпуск літаратуры экалагічнай тэматыкі ў 1801—1900 гг.**

| Гады | Колькасць выданняў | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Масква | Санкт-Пецярбург | Казань | Іншыя гарады | Гарады замежжа |
| 1801—1810 | — | 1 | — | — | 1 |
| 1811—1820 | — | — | — | — | — |
| 1821—1830 | — | 1 | — | — | 4 |
| 1831—1840 | — | 1 | 2 | 1 | — |
| 1841—1850 | 2 | 1 | — | — | 1 |
| 1851—1860 | 5 | 6 | 2 | — | 3 |
| 1861—1870 | 5 | 11 | — | — | 2 |
| 1871—1880 | 2 | 5 | 1 | — | 3 |
| 1881—1890 | 1 | 1 | — | 1 | 1 |
| 1891—1900 | 1 | 7 | — | — | 3 |
| Усяго | 16 | 34 | 5 | 2 | 18 |

Кнігі экалагічнага зместу выдаваліся як у дзяржаўных, так і ў прыватных друкарнях. Друкарні Казанскага, Маскоўскага універсітэтаў і Акадэміі навук у Санкт-Пецярбурзе займаліся пераважна выпускам навуковых прац і вучэбнага матэрыялу сваіх прафесараў і акадэмікаў — Э. А. Эверсмана, К. Ф. Рулье, А. Ф. Мідэндорфа, В. В. Дакучаева і інш. Найбольш вялікімі прыватнымі выдаўцамі, якія публікавалі літаратуру, што мы разглядаем, былі М. Л. Цыблен, М. В. Вольф, І. І. Глазуноў, А. Ф. Дзеўрыен. На іх долю прыпадае максімальная колькасць выпуску перакладной літаратуры (табл. 9).

Т а б л і ц а 9. **Колькасць экалагічных выданняў, выдадзеных у дзяржаўных і прыватных друкарнях у XIX ст.**

| Друкарні | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Дзяржаўныя | | Прыватныя | | |
| Універсітэцкія | Акадэміі навук | Санкт-Пецярбург | Масква | Іншыя гарады |
| 13 | 12 | 22 | 8 | 2 |

З прыведзеных даных бачна, што кнігі экалагічнай тэматыкі выдаваліся практычна ў роўных суадносінах як у дзяржаўных друкарнях, так і прыватных.

Да канца XIX ст. тэрмін «экалогія» ўзмацніў і дэферэнцыраваў свае пазіцыі ў біялагічным лексіконе і набыў прызнанне ў колах вучоных. Экалогія атрымала распаўсюджванне ў батаніцы, заалогіі і прыродазнаўчых навуках, упершыню разглядаліся праблемы ўздзеяння чалавека на змены фізіка-геаграфічных умоў прыроды (Г. Марш, СПб., 1866). Тэматыка выдадзеных экалагічных кніг умоўна пададзена ў табл. 10.

Неабходна падкрэсліць, што для твораў разглядаемага перыяду характэрна тое, што экалагічным даследаванням і абагульненням у апублікаваных кнігах былі прысвечаны толькі асобныя раздзелы, «чыста экалагічных» прац у той час яшчэ не існавала.

Т а б л і ц а 10. **Тэматыка экалагічнай літаратуры, выдадзенай у XIX ст.**

| Тэматыка | Колькасць выданняў |
|---|---|
| Заалогія | 26 |
| Батаніка | 10 |
| Прыродазнаўства | 6 |
| Агульныя працы | 12 |
| Чалавек і прырода | 1 |

З тыпалагічнага пункту погляду ўсе экалагічныя кнігі, якія «выходзілі ў свет» у XIX ст., — вучэбныя, навуковыя і навукова-папулярныя.

Своеасаблівай разнавіднасцю навукова-папулярных выданняў з'яўляліся публічныя выступленні прафесараў Расійскіх універсітэтаў. Напрыклад, прамова Я. А. Барзянкова, якую ён агучыў на ўрачыстым сходзе Маскоўскага імператарскага універсітэта 12 студзеня 1881 года «Гістарычны нарыс напрамкаў, якія існавалі ў заалагічных навуках у XIX стагоддзі», і праграмная прамова прафесара Казанскага універсітэта «Аб карысці навук прыродазнаўчых, і ў асаблівасці заалогіі» (1839) і інш. Прамовы прафесараў звычайна адразу друкаваліся ва універсітэцкіх друкарнях і распаўсюджваліся. Прычым тэма прамоў і іх змест, як правіла, не былі звязаны з афіцыйнай падставай іх вымаўлення.

Разам з тэарэтычнымі асновамі экалогіі таксама працягвае сваё развіццё прыкладная галіна ведаў — ахова прыроды. Ідэя неабходнасці рацыянальнага падыходу да выкарыстання прыродных рэсурсаў і іх аховы з цягам часу знаходзіць усё большае разуменне сярод прагрэсіўных пластоў насельніцтва. У XIX ст. утвараюцца шматлікія прыродаахоўныя аб'яднанні. Першым рускім органам, які дзейнічаў у галіне аховы прыроды, з'яўлялася «Таварыства для заахвочвання лясной гаспадаркі», якое ўзнікла ў 1832 г. у Санкт-Пецярбурзе [8].

Адным з першых мерапрыемстваў таварыства было набыццё ўсіх замежных кодэксаў і законаў прыродаахоўнага зместу для іх вывучэння і састаўлення адпаведнага настаўлення для карыстальнікаў. Гэта таварыства выдавала «Лясны часопіс», у якім былі асветлены пытанні правільнага (рацыянальнага) вядзення лесаводства, аховы глебы, вады і помнікаў прыроды, праблемы паляўнічай гаспадаркі. У 1857 г. быў створаны «Камітэт акліматызацыі жывёл і раслін», галоўнай задачай якога з'яўлялася «захаванне карысных жывёл ужо вядомых у Расіі, але знішчаных ад няўвагі прамыслоўцаў, і іх захаванне для карысці промыслу» [8, с. 9].

Вядомы яшчэ шэраг прыродаахоўных грамадскіх аб'яднанняў, якія пачалі сваю дзейнасць у XIX ст. Гэта «Таварыства для нагляду за абыходжаннем з жывёламі ў Пецярбурзе» (1864), «Таварыства садаводства», «Рускае таварыства птушкагадоўлі» (1888), «Каўказскае таварыства сельскай гаспадаркі» (1877), «Пецярбургскае лясное таварыства» (1869). У канцы 60-х гг. XIX ст. таварыствы прыродазнаўцаў былі створаны пры Пецярбургскім, Кіеўскім, Харкаўскім, Казанскім і Новарасійскім універсітэтах. Такія таварыствы ўзнікалі і ў іншых раёнах краіны (Арлоўскае, Сімферопальскае, Рыжскае таварыствы аматараў прыродазнаўства і інш.). Дзейнасць прыродаахоўных таварыстваў заключалася таксама ў папулярызацыйнай, прапагандысцкай і даследчай працы праз перыядычныя выданні гэтых арганізацый (такіх, як «Веснік Расійскага таварыства абаронцаў жывёл», «Запіскі Каўказскага таварыства сельскай гаспадаркі», «Аматар прыроды», «Працы таварыства прыродазнаўцаў»). Гэтыя аб'яднанні выдавалі асобныя брашуры па найбольш цікавых для насельніцтва пытаннях дзейнасці таварыстваў ці дакладаў, зробленых на пасяджэннях, тэкстаў публічных лекцый.

Акрамя дзейнасці грамадскіх арганізацый, афіцыйнымі органамі ўлады таксама зацвярджаліся заканадаўчыя дакументы, скіраваныя на рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў і ахову прыродных аб'ектаў. Намі быў прааналізаваны «Звод законаў Расійскай імперыі», які з'яўляецца сістэматычным зборам законаў, што дзейнічалі ў Расіі ў XIX ст. [9]. Вызначана, што нарматыўна-заканадаўчыя артыкулы прыродаахоўнага характару былі змешчаны ў статутах сельскай гаспадаркі і крымінальнага суда, ва ўрачэбным і лясным статутах, а таксама статуце аб пакараннях, што накладалі міравыя суддзі (г. зн. законы грамадскія) [10]. Колькасную характарыстыку выпуску артыкулаў прыродаахоўнага характару адлюстроўвае табл. 11.

Т а б л і ц а 11. **Колькасць артыкулаў прыродаахоўнага зместу, што прысутнічаюць у статутах законаў, якія дзейнічалі ў Расійскай імперыі ў XIX ст.**

| Назва статута | Колькасць артыкулаў прыродаахоўнага зместу |
|---|---|
| Статут сельскай гаспадаркі | 22 |
| Лясны статут | 26 |
| Статут крымінальнага суда | 5 |
| Урачэбны статут | 4 |
| Статуты аб пакараннях, што накладалі міравыя суддзі | 14 |

Статут сельскай гаспадаркі змяшчаў пералік драпежных звяроў, на якіх можна паляваць і якіх трэба ахоўваць; умовы рыбных промыслаў у азёрах, моры і рэках; дазвол на лоўлю розных парод дзічыны для акліматызацыі.

Лясны статут указваў меры аховы «абаронных», карабельных лясоў і гаёў; правілы і нормы высечкі лясных рэсурсаў; аб насаджэннях і развядзенні новых лясных масіваў.

Статут крымінальнага суда вызначаў крымінамальнае пакаранне за парушэнне правіл аб рыбных і цюленевых промыслах; пакаранне за знішчэнне рыбы ў рэках і сажалках праз атручванне вады ядавітымі і моцнадзейнымі рэчывамі; пакаранне за выкарыстанне ў Белым моры снасцей, якія забаронены.

Урачэбны статут уключаў ахову лекавых, мінеральных гразей; захады па прадухіленню забруджвання рэк, каналаў, крыніц ці калодзежаў выкіданнем у іх рэчываў; ахову крыніц мінеральных водаў.

Статут аб пакараннях, што накладалі міравыя суддзі (законы грамадскія), назначаў пакаранне за няспраўнае ўтрыманне памыйных ям, звоз смецця, бруду ў нявызначанае месца; за знявечанне чужых жывёл; пакаранні за рыбную ці іншую лоўлю ў чужых водах. Змест выдадзеных артыкулаў сведчыць аб шматграннасці прыродаахоўнай справы ўжо ў XIX ст.

У канцы разгледжанага перыяду вучоныя назапасілі масу пераканаўчых фактаў, сфарміравалі рад тэарэтычных і практычных абагульненняў у галіне экалогіі. Але сапраўднага росквіту навука дасягнула толькі ў мінулым стагоддзі. На наш погляд, у гэтым вялікая заслуга экалагічнай кнігі.

## Літаратура


1. Catalogue of books printed of the continent of Europe, 1501—1600 in Cambridge libraries / compiled by N. M. Adams. Cambridge univ. press, 1967.
2. Книга Белоруссии 1517—1817 гг.: Сводный каталог. Мн.: БелСЭ, 1986.
3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 96 т. Пузыны-Усая / Беларус. Энцыкл. Мн.: БелЭН, 2001. Т. 6. Кн. 1.
4. Сводный каталог руской книги гражданской печати XYIII века 1725—1800 гг. М.: «Книга», 1966. Т. 1-3.
5. Г р о м б а х С. М. Материалы к истории санитарного просвещения в России в XVIII веке. М.: Ин-т санит. просв., 1951.
6. Н о в и к о в Г. А. Очерки истории экологии животных. М.: «Наука», 1980.
7. История Академии наук СССР. М.; Л., 1958. Т. 1.
8. Р а х и л и н В. К. Природоохранное движение в России. М., 1985.
9. Свод законов // Энциклопедический словарь: В 82 т. / Под ред. И. Е. Андриевского, К. К. Арсентьева. СПб.: Брокгауз и Ефрон, 1900.
10. Полный свод законов Российской империи. СПб., 1903—1905. Т. 1-16.


*N. I. SHISHKINA, L. I. PETROVA, M. A. ZILBERGLEIT*

## ECOLOGICAL BOOK: FROM OLD GREEK SCIENTIST ACQUIREMENTS TO RUSSIAN EDITIONS OF XIX CENTURY

### Summary

This article is devoted to the making of complete imagination about an ecological book like a social and historical event. Its evolution is continuously connected with the social activity transformations. The repertory of the published ecological editions is considered just on the territory of the Russian State in XYIII — XIX centuries from the typological categories of bibliology.